косметический ремонт фасадов, что будет привлекать туристов и радовать самих жителей города, а также обратит внимание людей на социально значимые проблемы.

1. Медведева, О.П. Искусство граффити / О.П. Медведева. – М. : Феникс, 2005. – 268 с.

2. В Минске появилось еще одно здание, на фоне которого стоит сфотографироваться [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://news.tut.by/society/469565.html#. – Дата доступа : 5.01.2017.

3. Фестиваль Vulica Brazil [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vulica-brasil.by. – Дата доступа: 11.01.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Грыцава Н.Б.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Раманенкава В.І.

## «АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ М. ДЫЛЕЦКАГА Ў МІЖКУЛЬТУРНЫХ СТАСУНКАХ БЕЛАРУСІ І РАСІІ»

Беларуская музыка, якая мае багатую гісторыю, у розныя перыяды ўплывала на музычнае мастацтва блізкіх і далёкіх суседзяў. Шмат якія кампазітары беларускага паходжання набылі агульна-еўрапейскае прызнанне – Міхал Клеафас Агінскі, Станіслаў Манюшка, Напалеон Орда, Мечыслаў Карловіч. Кожны з названых творцаў пакінуў значны адбітак у гісторыі і культуры як Беларусі так і замежжа. Нездарма, даследчык беларускай музыкі З. Сасноўскі адзначае: ―Кампазітары нашага краю першымі ў Еўропе рабілі значныя музычныя адкрыцці" [3, с. 3–7].

Асаблівым чынам трэба адзначыць пераломныя перыяды ў гісторыя Беларусі, калі ў выніку вайны, ці саюзу краіна станавілася часткай тых ці іншых

дзяржаўных утварэннеяў і ў выніку выбітныя дзеячы тагачаснай Беларусі траплялі на пастаяннае месца жыхарства ў Расію, Польшчу і іншыя краіны.

Пра культурныя стасункі тагачаснай Беларусі і Расіі пішуць шматлікія даследчыкі, сцвярджаючы, што ў некаторых маскоўскіх хорах прымалі ўдзел беларускія спевакі: І. Канюхоўскі, А. Беражанскі. Але найбольш істотны ўклад у развіццё шматгалоснага спеву ў Расіі зрабіў Мікалай Дылецкі (1629 – каля 1680 гг.) выхаванец Віленскай акадэміі. У літаратуры, прысвечанай гэтаму музыканту, пакуль дыскутуецца пытанне яго этнічнай прыналежнасці і веравызнання: адны лічаць яго ўкраінцам, другія літоўцам ці ліцьвінам-беларусам, прадстаўніком ці праваслаўнай, ці ўніяцкай, ці каталіцкай канфесіі.

Даследчыца Л. Касцюкавец, абапіраючыся на вялікі фактаграфічны матэрыял, знойдзены ў архіўных зборах і запісаны ў экспедыцыях лічыла, што менавіта дзякуючы Мікалаю Дылецкаму, а таксама беларускаму тэарэтыку другой паловы XVII ст. Ціхану Макарыеўскаму (родам з-пад Оршы), партэснае мастацтва (род царкоўнай і канцэртнай музыкі, шматгалосныя харавыя спевы, якія выкарыстоўваюцца ва ўніяцкім і ў праваслаўным набажэнствах у рускіх, украінцаў і беларусаў) прабівае сабе дарогу ў Расіію. Заснавальнікам партэснага спеўнага стылю ў Маскве можна лічыць М. Дылецкага [2, с. 2].

М. Дылецкі атрымаў адукацыю ў Вільні, жыў і працаваў у гэтым горадзе. Бываў таксама ў Варшаве і Кракаве, а з 1675 г. пасяліўся ў Расіі. Дылецкі працаваў пры рускім двары, кіраваў харавымі калектывамі, пісаў музыку і распаўсюджваў свае творы, якія ў вялікай меры спрыялі ўвядзенню шматгалоснага спеву ў рускую музычную культуру. Можна меркаваць, што падмурак творчай дзейнасці М. Дылецкага быў закладзены яшчэ ў віленскія гады яго жыцця. У Вільні ён мог пазнаёміцца з многімі дасягненнямі еўрапейскай культуры, з музыкай і тэарэтычнымі працамі вядучых майстроў. Нагадаем, што ў XVII ст. Вільня была выдатным цэнтрам музычнага мастацтва, дзе існаваў адзін з буйнейшых у Еўропе ўніверсітэтаў, а пры велікакняжацкім двары ставіліся першыя еўрапейскія оперы (Марка Скакі і Верджыніа Пучытэлі). Тут працавалі вядомыя кампазітары Сымон Берэнт і Марцін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крэчмер, а таксама тэарэтык і кампазітар Мікалай Замарэвіч, які выкладаў у акадэміі тэорыю музыкі і творы якога сталі асноўнай факталагічнай базай пры стварэнні зборніка ―Мусікійская граматыка" [1, с. 47–48].

Увогуле ж лёс Дылецкага быў падобны на лёсы тых славянскіх, у тым ліку і беларускіх, дзеячаў, якія ў выніку руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. патрапілі ў Расію з беларускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх зямель. М. Дылецкі стаў носьбітам і праваднікам новых, заходніх тэндэнцый у культуру Расіі. У творчай жа трактоўцы партэснасці кампазітар падкрэслівае асноватворныя прынцыпы шматгалосся, ужо вядомыя і зацверджаныя на той час у Польшчы, Украіне і Беларусі, але яшчэ пакуль новыя для Расіі [1, с. 60].

Шматлікія даследчыкі лічаць М. Дылецкага стваральнікам цэлай школы мастацтва спеваў заходняга напрамку ў Расіі і ў праваслаўнай музыцы ў прыватнасці. І сапраўды, як тэарэтык і педагог М. Дылецкі стварыў школу, з якой выйшаў шэраг выдатных кампазітараў канца XVII і пачатку XVIII стст. М. Дылецкі з‘яўляецца самым вядомым прадстаўніком музычнай навукі эпохі барока, які яднае культуры беларускага, рускага, украінскага, польскага і літоўскага народаў і традыцыі розных канфесій.

Яго «Мусікійская граматыка» – фундаментальная распрацоўка ў галіне партэснага спеву. Трактат М. Дылецкага на працягу некалькіх стагоддзяў неаднаразова перакладаўся на розныя мовы, перапісваўся, выдаваўся і перавыдаваўся ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Смаленску, Туле, Цверы, Салікамску, а таксама ў Енісейску і многіх іншых гарадах Сібіры і Урала. У «Граматыцы» на аснове вывучэння вялікага тэарэтычнага і музычна-практычнага матэрыялу аўтар абагульніў і развіў лепшыя дасягненні еўрапейскага (у тым ліку польскага) харавога мастацтва і музычна-тэарэтычнай навукі. «Мусікійская граматыка» М. Дылецкага (першая /віленская/ рэдакцыя – 1675 г., другая /смаленская/ – 1677 г.) – прапанавана шырокаму колу знаўцаў музыкі, перш за ўсё – кампазітарам і выканаўцам, жадаючым авалодаць майстэрствам партэснага, шматгалоснага пісьма і спеву [1, с. 73–78].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дылецкі апісвае шэраг важных катэгорый музыкі (перш за ўсё, гармоніі): для адных ён вынаходзіць тэрміны-неалагізмы, іншыя (не менш важныя) прадстаўлены ім як агульналексічныя апісанні, напрыклад, “квінтовы круг” і “сальмізацыя”.

Такім чынам, М. Дылецкі з‘яўляючыся выхаванцам віленскага ўніверсітэта, які падпарадковаўся папулярным тэндэнцыям у музыцы і мастацтве Еўропы, увасобіў у сваёй навукова-практычнай дзейнасці папулярныя кірункі ў харавым выканальніцтве свайго часу. Потым трапіўшы на пастаяннае месца жыхарства ў Маскву ўкараніў “новае” шматгалоссе і падыходы да навучання спеваў у асяроддзі рускіх праваслаўных спевакоў. Сучаснае харавое выканальныцтва рускай праваслаўнай царквы таксама падпарадкоўваецца правілам партэснага спеву, якія былі закладзены, абаснаваныя і распрацаваныя М. Дылецкім.

________________

1. Дадзіёмава, В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / В.У. Дадзіёмава. – Мінск: *беларускі* гуманітарны культурна-адукацыйны цэнтр, 1994 г. – 94 с.

2. Костюковец, Л. Ещё раз о канте Николая Дылецкого / Л. Костюковец // Фалькларыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 11 / уклад.: В. В. Прыемка Н. Л. Канабеева; пад нав. рэд. Р.М. Кавалёвай; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 7–29.

3. Сасноўскі, З. Гісторыя беларускіх музычных уплываў / З. Сасноўскі. – Мінск: Медысонт, 2009. – 140 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ